Крыжаноўская В.А., студ. гр. 539
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Пісарэнка А.М.,
канд. філал. навук, дацэнт

# ЛІНГВІСТЫЧНЫ АНАЛІЗ ПУНКЦІРАЎ АЛЕСЯ РАЗАНАВА СА СБОРНІКА 2010 ГОДА "ВОПЛЕСКІ ДАЛАНЁЮ АДНОЮ"

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пункцір – першая і самая трывалая паэтычная эксперыментальная форма А. Разанава. Першыя пункціры (акупунктуры) датуюцца 1966 годам і працягваюць стварацца сёння [1, с. 67]. На працягу дзесяцігоддзяў плённай працы аўтара над сваімі творамі пункціры як паэтычная форма зведвалі пастаянныя змены як з боку структуры, так і ў сістэме вобразаў. Колькасць радкоў у гэтых паэтычных мініяцюрах пастаянна вагалася ад дзевяці да пяці, чатырох радкоў. Апошнія пункціры ўяўляюць сабой трохрадкоўі, падобныя да японскіх хоку, але часам не адпаведныя іх складовай будове. Сам аўтар гаворыць пра свой жанр наступнае: "Пункціры – гэта дужа кароткія вершы, вершы-формулы ў 3-4-5 радкоў. Я не ставіў загадзя фармальнай мэты, як у японскім хоку, стварыць 5-7 складоў. А як хоча змест, як хоча ўражанне, у колькі радкоў яно хоча ўкласціся… Мае пункціры – гэта назіранні. Іх не трэба чытаць, што асабліва актуальна ў наш час. Зірнуў – і ўсё, ужо прасвяціўся. Таму я яшчэ называю іх – акупунктуры".

У кожным сваім паэтычным зборніку, у які складовай часткай уваходзяць пункціры, аўтар прадстае перад чытачом у розных іпастасях: калі ў творах гэтага жанра ранейшага часу А. Разанаў выступае як сцвярждальнік фактаў рэчаіснасці, то ў творах больш позніх – усяго толькі назіральнік за гэтымі фактамі, ён – удумлівы сузіральнік жыцця: *Руіны запарушваюцца / рунь / уваскрашае руны / неба блізка* ("Шлях-360" 1981 г.); *Май на двары / цвітуць / спевамі дрэвы* (2010 г.)

Пункцірам са зборніка "Воплескі даланёю адною" уласціва завершанасць: да іх не трэба нічога дадаваць, або выкрэслівасць. Яны

ўяўляюць сабой адзінае цэлае, якое не патрабуе вобразнай дамалёўкі і дадумвання: *З саломінаю / нясу / ў руцэ падарунак ветру.*

Тэматыка ў пунктцірах А. Разанава застаецца нязменнай. Увага аўтара скіравана пераважна на апісанне станаў жывой і нежывой прыроды. У паэтычным зборніку “Воплескі даланёю адною” заўважаецца групоўка пунктціраў па пэўных блоках, гэтымі блокамі з’яўляюцца сезоны года у іх лагічнай паслядоўнасці, пачынаючы з апісанняў вясновай прыроды (паколькі раней год пачынаўся з вясны) і завяршаючы апісаннямі восені.

Пункцір – лаканічны верш, невялікі па памеры, але надзвычай змястоўны. Стварыць цэласную карціну рэчаіснаці і раскрыць асноўную думку ў некалькіх радках аўтару  ўдаецца  дзякуючы выкарыстанню разнастайных вобразных сродкаў мовы і сродкаў стварэння слоўнай выразнасці.

Для стварэння кантрасту ў адлюстраванні жыццёвых і прыродных з’яў ў пункцірах А. Разанаў часта выкарыстоўвае антонімы: ***Прыйшлі і пайшлі*** */ жабракі, а кійкі / пакінулі / умаляваўся / у палатно краявіду плот.*

У дадзеным выпадку антонімы ўяўляюць сабой аднакаранёвыя словы з супрацьлеглым значэннем, выяўляюць рух, зменлівасць чалавечага існавання на фоне нязменнага краявіду.

Акрамя стварэння кантрасту, антонімы ў пункцірах выконваюць яшчэ адну функцыю: ужытыя побач, яны забяспечваюць хуткую змену падзей, надаюць малюнку дынамізм: *У снежным бязмежжы выспа / заплаканых дрэў / цішыня /* ***ўздымаецца і ападае.***

На стварэнне малюнка ў руху працуе таксама  сінтаксіс і пунктуацыя. У асноўным вобразы пункціра вымалёўваюцца адным сказам, простым ці складаным (часцей з бяззлучнікавай сувяззю граматычных асноў, не аформленай пунктуацыйна): *Думае месяц / без дай прычыны / спаўзае з пагорка / снег.*

У якасці раздзяляльных знакаў прыпынку аўтарам часта выкарыстоўваюцца двукроп’е і працяжнік. Двукроп’е папярэднічае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тлумачэнню пэўнай з’явы, канкрэтызацыі абставінаў, дэталізацыі вобразаў: *У полі сляды**:** / адліга / займела правадыроў.*

Працяжнік звычайна аддзяляе простую мову ад мовы аўтара, што ўводзіцца ў тэкст з мэтай тлумачэння думак і ўчынкаў персанажаў. У якасці апошніх амаль заўсёды выступаюць метафарызаваныя з’явы прыроды. Сказам часам уласціа простая мова: *“Не аддавай мяне!”* **–** */ ля бярозы / сплаканы снег.*

Адметнасцю пунктуацыі ў пункцірах А. Разанава з’яўляецца тое, што аўтар ставіць знакі знакі прыпынку (у пэўнай ступені гэта датычыцца працяжніка і двукроп’я) не паводле агульнапрынятых пунктуацыйнах правілаў, а ў адпаведнасці з уласным унутраным адчуваннем своеасаблівай рытмікі верша. У адным выпадку паэт ставіць працяжнік, у другім – двукроп’е, нягледзячы на тое, што ў кантэксце пункціраў гэтыя знакі прыпынку часцей за ўсё ўзаемазамяняльныя.

Як і любому лаканічнаму жанру, пункцірам уласціва наяўнасць вялікай колькасці дзеясловаў са значэннем руху і стану рознай стылістычнай афарбоўкі, якія надаюць выказванню-назіранню экспрэсію і дынамізм: *Новымі ботамі /* ***тупаціць*** */ на ганку спадарыня / дзякуй снегу!.. ; Туды і сюды /* ***пераходзіць*** */ кладка ўвесь дзень /ручай.*

Арыгінальнай з’яўляецца тэматычная групоўка слоў у пункцірах. У радку, незалежна ад яго месца знаходжання, можа быць адно, два, а часам і тры словы. Вершы гэтага жанру А. Разанава нібы канструктар, структурныя кампаненты якога аўтар складае такім чынам, каб сэнсава выдзеліць пэўнае слова або некалькі слоў, што абазначаюць прадмет або з’яву, а часам прадмет і з’яву разам з уласцівасцю ці дзеяннем, якое яны выконваюць: *Вуліца ў шыбінах /* ***піша*** */ пальцамі пісьмы /* ***дождж.***

У прыведзеным творы ўвага скіравана перш за ўсё на дождж – выканальніка дзеяння. З мэтай адзяліць гэтае слова ад астатніх, А. Разанаў пакідае ў радку яго адно і, выкарыстоўваючы інверсію, выносіць яго ў постпазіцыю да ўсяго выказвання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такі падыход дапамагае аўтару дэталёва перадаць свае назіранні за навакольным светам, падпарадкоўваючы іх агульнаму рытму верша, а чытачу дае магчымасць лягчэй уявіць створаную карціну рэчаіснасці.

Аналіз моўных фактаў сведчыць, што асноўным сродкам стварэння рытмікі ў пункцірах з'яўляецца гукапіс. Менавіта з яго дапамогай верш набывае сваё непаўторнае гучанне (як вынік аўтарскага адчування, ўспрымання пэўных з'яў), а метафарызаваныя персанажы набываюць адметныя галасы: *Прынеслі* ***па****лонцы \ качкі* ***па****клон / з* ***па****лону / вырвалася Няміга*.

Рытм ствараецца, дзякуючы паўтору гукаспалучэння "па" ў пачатку слоў, на сэнсе якіх робіць акцэнт аўтар. Да таго ж, словы *палонка*, *паклон* і *палон* маюць сугучныя карані з рознай семантыкай, што ў дадзеным выпадку дапамагае ўявіць ваду ў палонцы, якая знаходзіцца ў палоне лёду. Як відаць, вынікам гукапісу стаў індывідуальна-аўтарскі прыём – паранамазія. І зноў А. Разанаў метафарызуе з'явы прыроды: *Э****лі****та /* ***лі****стота /* ***ля****ціць – застаецца / на****ле****та* ***ле****с*.

Як відаць, гукаспалучэнні мяккага [л'] з рознымі галоснымі ў першай і ў другой частцы верша, ужытыя ў мікракантэксце кантэкстуальных антонімаў, якія з'яўляюцца дзеясловамі руху – ляціць і застаецца – і якія сэнсава і граматычна падзяляюць пункцір на дзве супрацьлеглыя па значэнні часткі. Першая частка "рухомая", прадстаўленая зменлівым прыродным кампанентам – лістотай, другая – уяўляе сабой статычны малюнак – адлюстроўвае нерухомы лес. У прыведзеным прыкладзе ўзнікае супрацьпастаўленне, на якім заснавана такая стылістычная фігура як антытэза.

Такім чынам, пункціру як асабліваму паэтычнаму жанру ўласцівы асноўныя сродкі і прыёмы стварэння яго сэнсавай унутранай і фармальнай (структурнай) завершанасці: выкарыстанне антонімаў (вынік – стварэнне кантрасту – антытэзы); адметны сінтаксіс і аўтарская пунктуацыя; ужыванне дзеясловаў са значэннем стану і руху з мэтай метафарызацыі прыродных

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

з’яў; гукапіс, які дапамагае стварыць рытм верша і надаць малюнку пэўны настрой і гучанне (вынік – стварэнне стылістычнага прыёму – паранамазіі).

Спіс выкарыстанай літаратуры:


1. Івашчанка, А. Паэтыка Алеся Разанава: між медытацыяй і рацыяй / А. Івашчанка. – Мінск : БНТУ, 2008. – с. 67.
2. Сяленя, Я. Мужны голас [Электронны рэсурс] / Я. Сяленя. – Рэжым доступу: http://maiak.by/?p=18699.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ